11. Ільюцік, А.У. Беразіно / А.У. Ільюцік // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 102.
12. Мітрафанаў, А.Р. Даўгінава / А.Р.Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 142.
13. Мітрафанаў, А.Р. Равячкі / А.Р. Мітрафанаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л-Я. – С. 242.
14. Шадыра, В.І. Малышкі / В.І. Шадыра // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л-Я. – С. 58.
15. Звяруга, Я.Г. Баравыя / Я.Г. Звяруга // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 140.
16. Мітрафанаў, А.Р. Асінавік / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 244.
17. Штыхаў, Г.В. Варганы / Г.В. Штыхаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 145.
18. Мітрафанаў, А.Р. Старое Запонне / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 255-256.
19. Кенька, П.М. Вітунічы / П.М. Кенька, А.В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 167-168.
20. Егорейченко, А.А. Культуры штрихованной керамики / А.А. Егорейченко. – Минск : БГУ, 2006. – 207 с. : ил.
21. Шадыро, В.И. Ранний железный век северной Белоруссии / В.И. Шадыро ; под ред. А.Г. Митрофанова. – Минск : Наука и техника, 1985. – 126 с. : ил.
22. Митрофанов, А.Г. Железный век средней Белоруссии (VII-VI вв. до н.э. – VIII в. н.э.) / А.Г. Митрофанов. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с. : ил.
23. Кенько, П.М. Разведки на юге Витебской области / П.М. Кенько // Гістар.-археалаг. зб. – 2007. – Вып. 23. – С. 233 – 235.

**УДК 94(476.5)"11"**

## УДЗЕЛ ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА Ў МІЖУСОБНАЙ БАРАЦЬБЕ ПАЎДНЁВАРУСКІХ КНЯЗЁЎ У 60-80-ЫЯ ГАДЫ XII СТАГОДДЗЯ.

***М.П. КРУПСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. Д.В. ДУК)***

На працягу другой паловы XII ст. унутрыпалітычная сітуацыя на землях Паўднёвай Русі была складанай. У 1162 г. на полацкім стале зацвярдзіўся Усяслаў Васількавіч, які быў запрошаны полацкім веча з Віцебска. Полацкая зямля перажывала не самыя спакойныя часы, а таму была вымушаная шукаць саюзнікаў. Усяслаў Васількавіч знаходзіўся ў сваяцкіх адносінах са смаленскім князем Давыдам Расціславічам. Менавіта гэты накірунак быў выбраны для аб'яднання сіл у барацьбе з суседзямі. За дапамогу ў ваеннай справе смаленскі князь запатрабаваў Віцебск. Пад 1165 г. у летапісу знаходзім: «Давид Ростиславич седее витебьски» [1]. Аднак варта адзначыць, што Віцебск перадаваўся Смаленску ў часовае валоданне. Што мы і ўбачым у далейшай гісторыі ўзаемаадносін Полацка і Смаленска. Менавіта ў гэтым Л. В. Аляксееў бачыў пачатак распаду Полацкага княства [2, с. 275], а І. Ц. Бяляеў [3] і В.Я. Данілевіч [4] увогулі лічылі поўную страту незалежнасці Полацкім княствам. В. Л. Насевіч не выключае часовай залежнасці Полацка ад Смаленска. Спасылаючыся на тое, што гандлёвае пагадненне з Рыгай 1229 г. Мсціслаў Давыдавіч, тагачасны вялікі князь Смаленска, палпісваў ад імя Смаленска, Полацка і Віцебска [5, с. 15]. Варта адзначыць дальнавіднасць полацкага веча. Няма падстаў сумнявацца, што вялікі князь прымаў рашэнне аб перадачы ў часовае валоданне Віцебскам са згоды веча. Гэта была тонкая дэпламатыя тых часоў, якая на той момант апраўдала сябе поўнасцю.

У 1167 г. Валадар Менскі прадпрымае паход на Полацк і захватывае яго [2, с. 278; 6, с. 225; 7, с. 118]. Усяслаў Васількавіч збягае ў Віцебск, свой княжацкі надзел, які, нагадаю, займаў да прыхода на полацкі стол. Валадар рушыцца на Віцебск, але паварочвае войскі, атрымаўшы ложныя слухі аб надыходзе войск Рамана Смаленскага, саюзніка Усяслава Васількавіча. У сваю чаргу Усяслаў змог вярнуцца ў Полацк на княжанне.

Полацкія падзеі 1167 г. аналізуе М. І. Ермаловіч. Які ліча паражэнне Менска ў барацьбе за гегемонію ў Полацкай зямлі невыпадковым. Калі ў 1162 г. з дапамогай літвы можна было на месцы ў абароне атрымаць перамогу, то яе недастаткова было пры наступленні ўдалечыні. Нават каб не было

прыкрага здарэння з начной навальніцай, войска Валадара ўсё роўна не змагло б адолець злучаныя сілы Давыда і Рамана. Паход Валадара на Полацк і Віцебск з'явіўся бліскучым, але апошнім усплёскам магутнасці і славы Менска, бо пасля гэтага ён надоўга знікае са старонак нашай гісторыі. Віцебскае паражэнне, па сутнасці, паклала канец і гістарычнай дзейнасці Валадара Глебавіча, які сваё жыццё прысвяціў працягу справы бацькі - Глеба Усяславіча і старэйшага брата Расціслава Глебавіча – далейшаму ўмацаванню і росквіту свайго вотчыннага Менска [6, с. 226].

Сувязь са Смаленскам уцягвае Усяслава Васількавіча ў кааліцыі рускіх князёў, у якіх прымалі ўдзел менавіта і самі смаленскія князі. У гэты час пачынаецца жорсткая барацьба Суздаля з Ноўгарадам. У 1167 г. Андрэй Багалюбскі гвалтоўна саджае ў Ноўгарадзе выгнанага адтуль Святаслава Расціславіча - сына смаленскага князя, а смаляне і дзеючыя з ім за адно палачане «пути заяша и послы изьмаша новгородчкыя вслъдъ, а вести не дадуще Кыеву» [8, с. 148]. Аднак, сувязь з кіеўскім Мсціславам усё ж была наладжана абыходным шляхам праз ворагаў палачан - князёў Валадара Глебавіча і Вячаслава Святаславіча [6, с. 229]. У сваю чаргу, Святаслаў Расціславіч не змог утрымацца і збег у Суздаль, наўгародцы ж чакалі стаўленіка Кіева - сына кіеўскага Мсціслава, з якім: “Въ лъто 6676 (1168) … ходиша Новгородьци съ Пльсковици къ Полотьску; и пожьгъше волость, воротишася отъ города за 30 вьрстъ” [8, с. 148]. Такім чынам, акрамя саюза са Смаленскам, Полацкае княства выступае саюзнікам Андрэя Багалюбскага з Суздаля. Ноўгарадскі летапіс паведамляе аб іх сумесным паходзе на Кіеў у шэрагу паходаў: “Въ лъто 6676 (1168) … ходиша Ростиславці съ Андреевицьмь, и съ Смолняны, и съ Полочяны, и съ Муромьци, и съ Рязаньци, на Мьстислава Кыеву; онъ же не бияся с ними, отступи волею Кыева” [8, с. 148]. А таксама на Ноўгарад: “Въ лъто 6676 (1169) … на зиму, придоша подъ Новъгородъ Суздальци съ Андреевицемь, Романъ и Мьстислаъ съ Смольняны и съ Торопьцяны и съ Муромьци и съ Рязаньци съ двема князьма, Полоцьскый князь съ Полоцяны, и вся земля просто Русьская…” [8, с. 149]. Гэтыя дадзеныя могуць паказваць на невялікую састаўную частку палачанаў у аб'яднаным войску.

Бачым мы палачанаў і ў паходзе Андрэя Багалюбскага на Кіеў у 1174 г. [6, с. 231; 7, с. 118], выкліканага імкненнем выгнаць непакорлівых Расціславічаў з Паўднёвай Русі. Летапіснае сведчанне, што Андрэй Багалюбскі “полотьским князям пойти повеле всем”, ясна паказвае, што палачане вымушаны былі лічыцца з сілаю суздальскага ўладара. Але для нас асабліва важна падкрэсліць загад Багалюбскага ўсім полацкім князям, што не можа не ўказваць на іх поўнае адзінства. І гэта, як убачым, асабліва яскрава выявіцца ў 1180 г. Заўважым таксама, што ў гэтым (дарэчы, няўдалым) паходзе ўдзельнічалі тураўскія і пінскія князі. Такім чынам, тут прысутнічалі сілы амаль усёй сучаснай Беларусі. Калі б мы былі цвёрда ўпэўнены, што пад гарадзенскімі князямі, якія таксама тут былі, трэба разумець гродзенскіх, то сюды трэба было б дадаць і іх [6, с. 231].

Летапіс пад 1175 г. занатаваў факт выдачы замуж дачкі Усяслава Васількавіча, імя якой у летапісах засталося не зафіксаваным, за аднаго з суздальскіх князёў - Яраполка Расціславіча. Важна адзначыць, што тут Усяслаў названы віцебскім князем [1, с. 529]. На падставе гэтага В. Я. Данілевіч выказаў меркаванне, што палачане, незадаволеныя прасмаленскай палітыкай Усяслава Васількавіча, пазбавілі яго полацкага пасада, і ён быў вымушаны ісці ў Віцебск [4, с. 97]. Але наўрад ці так было, бо пад 1178 і 1180 гг. мы бачым Усяслава полацкім князем. Хутчэй за ўсё, што летапісец дапусціў тут недакладнасць, назваўшы яго віцебскім князем. Найбольшая каштоўнасць гэтага летапіснага сведчання для нас у тым, што яно гаворыць пра імкненне Полацка паглыбіць сувязі з Суздальскай зямлёй як важнейшым фактарам тагачаснай рускай гісторыі і на падставе іх палепшыць сваё палітычнае становішча, што і дасць свае станоўчыя вынікі [6, с. 231-232].

Трэба адзначыць, што летапісныя звесткі полацкай зямлі за перыяд 60-80-х гадоў XII ст., скупыя і малалікія, у значнай ступені павярхоўныя, для адлюстравання поўнай карціны палітычнага жыцця Полацкай зямлі ў разглядаемы перыяд. Але звесткі, якія захаваліся, даюць падставу зрабіць вынік, што ў гэты час на полацкіх землях назіраецца аб'яднанне палітычных сіл унутры дзяржавы. Як ужо вядома, феадальная раздробленнасць на тэрыторыі ўсходніх славян найперш закранула Полацкае княства, што сведчыла аб яе больш высокім сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці. Гэта і стала галоўнай прычынай выдзялення з усіх астатніх славянскіх дзяржаў і аформілася ў самастойную палітычную адзінку. І ў сваю чаргу сама стала дзяліцца на паасобныя ўдзелы, між якімі ўзнікла барацьба, але яна, як мы бачылі, насіла не столькі сепаратысцкі характар, колькі характар барацьбы таго ці іншага ўдзела за вяршынство ў Полацкай зямлі [6, с. 234], што знаходзіла сваё знешняе выяўленне. Якое не выходзіла за межы Полацкага княства ў імкненні розных прадстаўнікоў роду Усяславічаў замацавацца на полацкам стале.

Палітычная сітуацыя змяняецца кардынальным чынам. У 1175 г. памірае ад баярскай змовы Андрэй Багалюбскі. А ў 1179 г. памірае былы вораг палачан Мсціслаў Расціславіч Наўгародскі, а яшчэ праз год, у 1180 г. – іх асноўны саюзнік Раман Расціславіч Смаленскі.

Кіеў страціў значэнне першага горада. Але барацьба за ўладанне ім паміж групоўкамі працягвалася. Каб знайсці нейкі кампраміс і аслабіць палітычнае супрацьстаянне, кіеўскае баярства ўвяло ў княстве

падвойнае праўленне. На княжанне запрашаліся адразу два князі, кожны з якіх прадстаўляў адну з варагуючых груповак. Паколькі асноўная барацьба вялася паміж Ольгавічамі і смаленскімі Расціславічамі (нашчадкамі Манамаха). Кіеўляне запрасілі чарнігаўскага князя Святаслава Усеваладавіча (Ольгавіча па паходжанні) і смаленскага Рурыка Расціславіча. Меркавалася, што такая сістэма дуумвірату некалькі аслабіць усобіцы і дасць магчымасць лепш арганізаваць абарону паўднёвых межаў Русі ад набегаў полаўцаў. Аднак, як паказалі падзеі, ліквідаваць усобіцы гэтай мерай не ўдалося. Яны ўспыхвалі раз за разам, пагражаючы часамі ператварыцца ў вялікую вайну.

Старэйшым князем у дуумвіраце лічыўся Святаслаў, які правіў самім Кіевам, іншы князь - Рурык кіраваў кіеўскай вобласцю і жыў у Белградзе недалёка ад Кіева. Перайшоўшы ў Кіеў, Святаслаў, у адпаведнасці з дзеючым парадкам, перадаў Чарнігаў свайму малодшаму брату Яраславу. Адпаведна - у Ноўгарадзе-Северскім, дзе сядзеў да гэтага Яраслаў, сеў яго стрыечны брат Ігар, будучы герой «Слова пра паход Ігараў» [9].

Абодва суправіцеля Кіеўскага княства імкнуліся аднаасобна ўзначаліць княства і толькі чакалі зручнага моманту. Нагатове былі і саюзнікі абодвух князёў. Абстаноўка была вельмі напружанай. За Святаславам назіраў і родны брат Рурыка - Давыд Расціславіч, які сядзеў у Вышгарадзе. Узаемная падазронасць даходзіла да кур'ёзаў. Летапіс распавядае, як аднойчы Святаслаў паляваў на адным беразе Дняпра, а Давыд - на іншым. Князі не гэтулькі былі занятыя паляваннем, колькі назіралі ўважліва адзін за адным, баючыся падвоху. Нечакана Святаслаў напаў на Давыда, але таму ўдалося бегчы да Рурыка ў Белгарад. Пачалася падрыхтоўка да вайны. Супрацьстаялыя бакі адправілі ганцоў да сваіх саюзнікаў: Рурык - да галіцкага князя Яраслава Асмамысла і двум луцкім князям, сваім братам - Інгвару і Усеваладу [9, с. 20-21]. Святаслаў, са свайго боку, паспяшаўся ў Чарнігаў, дзе сабраў на раду сваіх прыхільнікаў. Супрацьстаянне перарасло ў адкрытыя ваенныя дзеянні, якія ахапілі розныя землі за межамі Паўднёвай Русі. Спачатку Святаслаў Усеваладавіч распачаў паход супраць суздальскага князя, а затым накіраваўся да Ноўгарада. Яраслаў жа з Ігарам і атрадам полаўцаў выступіў супраць смаленскіх Расціславічаў [7, с. 118; 6, с. 227-239; 2, с. 278-280].

Пад 1180 г. склалася сітуацыя так, што ў барацьбу былі ўцягнутыя і полацкія князі, у якіх былі свае разлікі [10, с. 46-47]. Яны па сутнасці страцілі кантроль над Друцкам, князі якога звязалі сябе са Смаленскам. Таму полацкія князі ўвайшлі ў саюз з Ольгавічамі супраць смаленскіх Манамахавічаў. Напэўна не выпадкова месцам злучэння войскаў Ольгавічаў і полацкіх князёў быў абраны менавіта Друцк. Было вырашана, што вялікі князь Святаслаў Усеваладавіч, толькі што ваяваўшы ў Суздальскай зямлі заедзе з сынам Уладзімірам ненадоўга ў Ноўгарад, а вяртаючыся на поўдзень, паверне да Друцка і падтрымае нападаючыя войскі.

Да Друцка ўжо падыходзілі войскі Брачыслава Васількавіча Віцебскага, Усяслава Васількавіча Полацкага, Усяслава Мікуліча Лагожскага, Васілька Брачыславіча, князя Ізяслаўскага, а таксама больш дробныя князі Полацкай зямлі - Андрэй Валодшыч і яго пляменнік Ізяслаў [7, с. 119; 4, с. 280]. Варта таксама адзначыць, што ў шэрагу пералічаных князёў, мы не бачым менскага князя, што гаворыць пра страту менскай валасцю былога ўплыва [7, с. 119].Таксама палачане прыйшлі з літоўскімі [7, с. 120] і ліўскімі атрадамі. Полацкая зямля паўстае не толькі ў адзінстве сваёй дзяржавы, але і ў сувязі з падуладнымі землямі ў Ніжнім Падзвінні і Верхнім Панямонні. Так, у 1180 г. на берагах рэчкі Друці рускія апынуліся ў адным лагеры з тымі, хто традыцыйна лічыўся супернікамі Русі, супраць каго летапісцы і аўтар «Слова пра паход Ігараў» заклікалі князёў аб'яднаць свае сілы.

Тым часам на дапамогу Глебу Рагвалодавічаў Друцкаму прыходзіць Давід Смаленскі. Аб'яднаўшы свае сілы, вырашылі ісці насустрач войскам Яраслава і Ігара, каб разбіць іх, гэтым самым не даўшы ім магчымасці злучыцца з войскамі Святаслава, які ішоў з Ноўгарада пад Друцк. Аднак чарнігаўцы, разгадаўшы намер Давыда, вырашылі пазбегнуць бою і ўмацавацца на беразе Друці. На працягу цэлага тыдня смаленскі князь імкнуўся навязаць бой Яраславу і Ігару, аднак яны пазбягалі яго і, дачакаўшыся прыходу Святаслава з наўгародцамі, злучыліся з імі і перайшлі на другі бок Друці. Убачыўшы супроць сябе такую сілу, Давыд не адважыўся ўступаць з ёй у бой і ноччу ўцёк у Смаленск. Чарнігаўцы не сталі гнацца за ім, баючыся, што ён можа напасці на іх уладанні, і пайшлі ў Кіеў. Святаслаў з наўгародцамі напаў на Друцк, але ўзяць яго не змог, спаліўшы толькі астрог (перадавыя ўмацаванні), пасля чаго, адпусціўшы наўгародцаў, накіраваўся спачатку ў Рагачоў і адтуль Дняпром ў Кіеў [6, с. 239; 2, с. 280].

У 2008-2009 гг. у ходзе раскопак Друцка і ваколіц горада пад кіраўніцтвам В. Н. Ляўко быў даследаваны курган з 38 пахаваннямі, якія датаваныя сярэдзінай XII ст. А гэта прыкладна той самы час, калі і адбыўся ваенны канфлікт каля ваколіц горада. Наўрад ці зможам памыліцца, калі выкажам здагадку, што менавіта гэтыя воіны могуць быць пахаваны ў гэтым магільніку [11, с. 18, 143-155]. Што пацвярджаецца знаходкай ромбападобных і шылавідных бранябойных квадратнага перасеку з простым упорам наканечнікаў стрэл у пахаваннях № 14, 32 [11, с. 153].

Перамога каля Друцка дасталася лёгка, асабліва для палачанаў. Ні адзін летапіс не паведамляе, каб палачане прымалі непасрэдны ўдзел у ваенных дзеяннях. Абышоўшыся малой кроўю, яны вярнулі сабе

важную частку сваёй зямлі. Падзеі 1180 г. з'явіліся для Полацка бліскучай дэманстрацыяй яго ўзноўленага адзінства і баявой моцы. Гэта было і святам дальнабачнай полацкай дыпламатыі, якая змагла абараніць лёс дзяржавы ад магчымага гнёта суседзяў.

ЛІТАРАТУРА


1. Полное собраніе Русскихъ лѣтописей. Изданное по Высочайшему повелѣнию Археографическою коммиссеію. Томъ второй. Изданіе второе. Лѣтопись по Ипатскому списку. С-Петербургъ. Типографія М.А. Александрова, 1908. – 638 с.
2. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля (Очерки истории Северной Белоруссии). В IX-XIII вв. – М. : Наука. 1935. – 295 с. : ил.
3. Беляев, Д.И. Исторія Полотска, или Сѣверо-Западной Руси, отъ древнѣйшихъ временъ до Люблинской уніи / Д.И. Беляев. – М. : Въ Синодальной Типографіи, 1872. – 456 с.
4. Данилевичъ, В.Е. Очеркъ исторіи Полоцкой земли до конца XIV столѣтія / В.Е. Данилевичъ. – Кіевъ : Типографія императ. ун-та Св. Владіміра В. І. Завадскаго, Больш.-Васильковская, д. №№ 29-31. 1896. – 260 с.
5. Насевіч, В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы. – Мінск : Полымя, 1993. – 160 с. : іл.
6. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: Полац. і новагард. перыяды / М.І. Ермаловіч, прадм; М. Ткачова. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 366 с. ; іл.
7. Загорульский, Э.М. Белая Русь с середины I тясячелетия до середины XIII века / Э.М. Загорульский ; вступ. ст. В.А. Тепловой. – Изд. второе, доп. – Минск : Четыре четверти, 2014. – 532 с. : ил.
8. Новгородская лѣтопись по синодальному харатейному списку. – СанктПетербургъ : Типографія Императ. Акад. Наукъ. – 1888. – 560 с.
9. Булахов, М.Г. «Слово о плъку Игоревъ» в переводах на славянские языки XIX-XX вв. / М.Г. Булахов. – Минск : Беларус. навука, 2013. – 360 с.
10. Друцк старажытны: Да 1000-годдзя ўзнікнення горада / рэд. кал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэдактар) [і інш.] : Маст. У.М. Жук. – Мінск : БелЭн, 2000. – 128 с. : іл.
11. Друцк: Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX – XII вв., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владения в XIII – XVIII вв., ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники архитектуры и объекты туризма / О.Н. Левко [и др.] ; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.); науч. ред. О.Н. Левко ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2014. – 619, [5] с. : ил. – (Древнейшие города Беларуси).


**УДК 314/148(476/5)”8/12”**

## ДЭМАГРАФІЧНАЯ СТРУКТУРА НАСЕЛЬНІЦТВА ПОЛАЦКА Ў IX – СЯРЭДЗІНЕ XIII СТАГОДДЗЯЎ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АСПЕКТ.

***М.П. КРУПСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. Д.В. ДУК)***

Полацк як горад у сучасным разуменні гэтага слова ў канцы X - XI стст. абрастаў новымі паселішчамі і ператвараўся ў якасна новы па змесце сацыяльны арганізм - адміністрацыйна-ваенны, рэлігійны, культурны, рамесна-гандлёвы цэнтр буйнога княства Усходняй Еўропы.

Пасяленні палачан размяшчаліся і па-за межамі крапасной сцяны і былі даследаваны археалагічна. Забудова XI-XVIII стст. адкрыта на “вянцы” правага берага р. Палаты насупраць Верхняга і Ніжняга замкаў, полацкага гарадзішча [3, с. 133]. Г. В. Штыхавым таксама было вызначана, што старажытным дзяцінцам Полацка з’яўлялася гарадзішча IX ст. На правым беразе р. Палаты каля гарадзішча было размешчана паселішча-перадграддзе плошчай 0,25 га. Верхні замак пачаў засяляцца напрыканцы X ст. [5].

У выніку палявых археалагічных даследаванняў 1928, 1957, 1959-1964 гг. і 1967-1968 гг. былі атрыманы першыя даныя аб развіцці тапаграфічнай структуры Полацка, узроўні развіцця гарадскіх рамёстваў, сувязяў пасадскага насельніцтва. Д. Ул. Дук адзначае, што маштабы археалагічных раскопак тых часоў былі вельмі значнымі (усяго вывучана больш за 964 м плошчы). На жаль, большасць справаздач па выніках раскопак утрымлівае толькі агульныя звесткі пра характар культурнага пласта і колькасць знаходак у ім. Графічнае суправаджэнне справаздач (планы раскопаў, гарызантальная і вертыкальная стратыграфія, планіграфія і гарызонты размяшчэння асобных знаходак) не заўсёды адлюстравана дастаткова поўна [3, с. 15].

Значную цікавасць уяўляюць пытанні дэмаграфічнай структуры Полацка на розных этапах яго існавання. Для старажытнага горада XI ст. такая спроба была ўпершыню зроблена Г. В. Штыхавым. Адносна тапаграфічнага развіцця, «посад был по меньшей мере в трёх местах, причём главная его часть (великий посад) занимала пространство между Полотой и Западной Двиной, включая Нижний замок»